# БРЫЛЕЎСКІ летапіс

№ 7 (89)
сакавік
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

КАМПЬЮТАРНЫ ВАРЫЯНТ

## Вясна!..

01/03/2009

# Віншуем з Юбілеем!

**15 сакавіка**
**Кацярына Васільеўна ІВАНЦІВ**
*адзначае 75-годдзе*

**5 сакавіка**
**Ганна Фёдараўна ВАСЮРЭНКА**
*адзначае 70-годдзе*

**10 сакавіка**
**Васіль Пятровіч МАЖАЕЎ**
*адзначае 65-годдзе*

# З Днём Нараджэння!

## У сакавіку нарадзіліся:

**3 - Яўгенія Браніславаўна Нядвецкая**
**5 - Людміла Андрэеўна Парфененка**
**8 - Святлана Дзянісаўна Пятрова**
**8 - Станіслаў Андрэевіч Васюрэнка**
**11 - Наталля Віктараўна Масіеўская**
**11 - Людміла Ўладзіміраўна Сідарава**
**14 - Рыгор Уладзіміравіч Інчанка**
**15 - Любоў Якаўлеўна Пухаленка**
**20 - Віктар Міхайлавіч Новікаў**
**22 - Віталь Генадзьевіч Пшанічны**
**24 - Галіна Фёдараўна Жукава**
**24 - Мікалай Генадзьевіч Смалякоў**
**24 - Андрэй Юр'евіч Пруднікаў**
**28 - Валянціна Аляксееўна Лачкоўская**
**28 - Валянціна Васільеўна Ляутка**

## Религиозные праздники

**ПРАВОСЛАВНЫЕ**
**с 2 марта по 18 апреля** - Великий пост

**КАТОЛИЧЕСКИЕ**
**1 марта** - 1 Воскресение Великого Поста
**8 марта** - 2 Воскресение Великого Поста
**15 марта** - 3 Воскресение Великого Поста
**19 марта** - день Святого Иосифа
**22 марта** - 4 Воскресение Великого Поста
**25 марта** - Благовещение
**29 марта** - 5 Воскресение Великого Поста

**ИУДЕЙСКИЕ**
**10 марта** - Пурим

**МУСУЛЬМАНСКИЕ**
**8 марта** - День Рождения Пророка Мухаммада



# Прыйшла!..

Негледзячы на ўсе зімовыя забабоны -- снягі, што не жадаюць зыходзіць, маразы па начах -- яна прыйшла. І хоць за вокнамі сцюдзёна, мы ведаем, что толькі яна прынясе сонечную ўсмешлівасць, шматмоўную гаманлівасць прыроды і сардэчную цеплыню кожнага надыходзячага дня. Яна нясе надзею і спадзяванні на лепшае. Яна -- пачатак новых і, часам, нязведаных шляхоў. Яна -- ***Вясна!...***

# ГАРАЧАЕ СЭРЦА

У загадчыцы буфета вёскі Брылі Людмілы Леанідаўны Бураевай ёсць начальнікі. Напярэдадні 1 сакавіка яны паглядзелі ў каляндар і сказалі: "О, глянь -- вясна!" А раз вясна, то гэта значыць, што ўжо цёпла. А раз цёпла, то трэба даць каманду: "Ацяпленне адключыць!" Каманда пайшла. І Людміла Бураева, як чалавек законапаслухмяны, адключыла сваю качагарку. А на вуліцы, нягледзячы на надыход каляндарнай вясны, сапраўднае зімовае надвор'е. І, здаецца, нават крыху цяплей, чым у памяшканні буфета. А паколькі працаваць трэба і ніхто плану тавараабароту не адмяняў, апранула наша Людміла на сябе стос адзёжак ды ўстала за прылавак -- хукаючы на замярзаючыя рукі і спадзяючыся на дапамогу свайго гарачага сэрца. Але спадзяванні так і засталіся спадзяваннямі, і ў акне буфета з'явілася вось гэтая аб'ява. І амаль два тыдні Брылі былі выбіты са звыклага рытму...

І хочацца запытацца ў тых начальнікаў: "На чым эканомім, шаноўныя? На здароўі сваіх надначаленых?.."

# Рамонт

Другая палова лютага і пачатак сакавіка прайшлі ў Брылях пад знакам вялікага касметычнага рамонту. Будаўнікі з брыгады МУКП "Жылкамгас" прывялі, як кажуць, у божы выгляд пад'езды дамоў па вуліцы Юбілейнай -- адрамантавалі, пафарбавалі, замянілі, дзе трэба, шкло. Цяпер у кватэраздымшчыкаў будзе менш пытанняў наконт таго, куды ідуць іх грошы. Хочацца сказаць вялікі дзякуй людзям за працу. І галоўнае -- каб вось гэтая прыгажосць працягнулася як мага даўжэй.

# Са святам вясн

8 сакавіка 2009 года ў Брылеўскім сельскім Доме культуры адбыўся святочны канцэрт, прысвечаны міжнароднаму жаночаму дню. Першымі выступілі дзеці: верш, прысвечаны маме, прачытаў Аляксей Аляксейкоў, а Карына Бірукова, Надзея Журава, Яна Какоўка і Яна Пшанічная станцавалі вясёлы танец. Дар'я Саўчына праспявала вядомую песню "Вместе мы с тобой". Сваё майстэрства прадэманстраваў вакальны ансамль "Любава" -- Любоў Шастакова, Таццяна Філімоненка, Галіна Жукава, Святлана Цеплякова і Любоў Цымлякова праспявалі песні "Называют меня некрасивою", "Самовар" і "Чарка на пасашок". Спецыяльна да свята падрыхтавалі песні салісткі -- Г.Жукава праспявала песню "Милая мама", а Л.Шастакова выканала знакамітую "Поговори со мною, мама". Падтрымаў гэтую лінію і Мікалай Яцкоў, выканаўшы свае песні "Маміна хустка" на верш Сяргея Законнікава і ўпершыню "Не плач, мама" на верш Раісы Баравіковай. Таксама ўпершыню прагучалі яшчэ тры песні на вершы Раісы Баравіковай -- "Трошкі шкада" у выкананні Алы Яцковай, "Другія берагі" і "Ой ды за акенцам" у выкананні Алы і Мікалая Яцковых. Лірычную песню "Косы ивы" з пачуццём выканала Крысціна Ляутка. Трэба асобна адзначыць працу трох удзельніц нашай мастацкай самадзейнасці -- Юліі Ярмаш, Настассі Саўчынай і Таццяны Пшанічнай. Яны вельмі добра зрабілі цэлы мастацкі блок: спявалі сольна (Ю.Ярмаш "Шоу-бизнес" і "Се ля ви", Н.Саўчына "Я не вернусь", Т.Пшанічная "Трудный возраст"), прагучалі дуэтам (Н.Саўчына і Т.Пшанічнай "Мало" і "Лучшая ночь"), утраіх праспявалі песню "Опиум", а потым станцавалі танец "Калина" і паказалі цікавую сцэнку з жыцця бамжоў, што жывуць ля Рублёўскай шашы каля Масквы. Глядзельная зала вельмі добразычліва аднеслася да ўсяго, што ўбачыла і пачула. І ёсць спадзяванне, што святочны веснавы настрой захаваецца ў нашых аднавяскоўцаў надоўга.

*А.С.*

А.Аляксейкоў

Танец

Д. Саўчына

Спявае ансамбль "Любава"

Т.Пшанічная, Ю.Ярмаш. Н.Саўчына

Спявае Л.Шастакова

# сны і каханя!

К.Ляутка

На кожную песню трэба было пераапрануцца належным чынам...

Вось яны якія -- "рублёўскія" бамжы!..

Гукарэжысёр канцэрта Вольга Майбурава з сынам Антонам, які ўжо прызвычаіўся да закуліснага жыцця.

Задорная "Калина"

**Фотаздымкі Міколы Яцкова, Алы Яцковай, Вольгі Майбуравай**

КАМЮНІКАТ.org

# Жанчына. Вясна. Прыгажосць

4 сакавіка 2009 года ў магілёўскай бібліятэцы № 9 адбыла-музычна - паэтычная вечарына з узнёслай назвай "Жанчына. Вясна. Прыгажосць", прысвечаная Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка. У госці да чытачоў бібліятэкі прыехалі бібліятэкар Брылеўскай сельскай бібліятэкі Ала Міхайлаўна Яцкова і дырэктар Брылеўскага сельскага Дома культуры Мікалай Адамавіч Яцкоў. Вядучая вечарыны бібліятэкар Валянціна Мікалаеўна Кабазава павіншавала усіх прысутных з надыходзячым святам і паведаміла, што брылеўскія музыкі прывезлі сваю новую святочную праграму, складзеную з вершаў Мікалая Яцкова і песен, якія ён напісаў на вершы беларускіх паэтаў. Слухачы з вялікім задавальненнем акунуліся ў чароўны свет паэзіі і музыкі, падтрымліваючы гучнымі апладысментамі кожную песню...

Трэба сказаць, што гэта не першая такая сустрэча, і можна казаць аб з'яўленні новай перадсвяточнай традыцыі. Якая і надалей будзе замацоўвацца.

*Аліна САВІЦКАЯ.*

В.М.Кабазава

Гучыць песня...

М.А.Яцкоў

А.М.Яцкова

Словы падзякі...

Фотаздымкі Вольгі Пліндовай.

Белорусская НИВА

11.03.2009 г.

Беларускі паэт Мікола ЖЫЛІНСКІ расказвае пра сваю малую радзіму:

## Мая Камяніца

Там, дзе бруяцца крыніцы,
Там, дзе шуміць Белы гай,
Вёска стаіць Камяніца --
Родны і любы мой край.
Там, дзе хаціна матулі,
Там, дзе жывуць сваякі,
Родная вёска прытуліць,
Стрэнуць сябры-дружбакі.
Там, дзе дзяцінства калыска,
Там, дзе юнацтва вясна,
Столькі людзей сэрцу блізкіх
Мроіцца ноччу мне ў снах.

Там, дзе матуляй сагрэты,
Родны бацькоўскі парог
Вабіць зімою і летам
З блізкіх і дальніх дарог.
Там, дзе пяюць жаваронкі,
Дзе даспяваюць жыты, --
Родная сэрцу старонка,
Край дарагі, -- гэта ты!

Цытата

*Жизнь коротка! Нарушай правила! Прощай быстро! Смейся неудержимо! Целуй медленно! Танцуй, будто никто не смотрит! Пой, будто никто не слышит! Люби, будто никто не причинял тебе боль! Ведь жизнь дается человеку один раз! И прожить её надо так, чтобы там наверху одурели и сказали: "НУ-КА ПОВТОРИ!"*

Неизвестный автор.

ЗВЯЗДА

19.03.2009 г.

Улады Лондана б'юць трывогу: у 2008 годзе каля 68 тысяч жыхароў англійскай сталіцы атрымалі траўмы рознай ступені цяжару, наляцеўшы на ліхтарныя слупы, размаўляючы па мабільных тэлефонах падчас руху або адпраўляючы SMS. Каб знізіць колькасць няшчасных выпадкаў, муніцыпалітэт усходняга Лондана прыняў арыгінальнае рашэнне: усе ліхтарныя слупы на Брык-лэйн будуць загорнутыя ў паралон. У выпадку, калі эксперымент будзе ўдалым і колькасць траўмаў зменшыцца, у паралон будуць "апранутыя" слупы і на іншых лонданскіх вуліцах.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

12.03.2009 г.

### КАБ ГРОШЫ НЕ ПАКРЫЎДЗІЛІСЯ

Грошы заўсёды выклікалі вялізную цікавасць у свядомасці чалавека. Грошы выступалі

# Брылеўская бібліятэка інфармуе...

знакам багацця і служылі прадметам абмену, гандлю, выкупу або проста падарункам. У той жа час у народным асяроддзі да грошай было даволі стрыманае дачыненне. Адно з "залатых правілаў" сведчыла: ніколі не падбіраць грошы на раздарожжы, бо менавіта грашыма "адкупляюцца" ад хвароб, бед і нястачаў.

- Катэгарычна забаранялася праводзіць грашовыя разлікі пасля заходу сонца або ў панядзелак.
- Забаранялася гаварыць, што ў хаце зусім няма грошай, нават калі іх і сапраўды вельмі мала, бо лічылі, што грошы "пакрыўдзяцца" і пакінуць хату назаўсёды.
- Манеты сімвалізавалі шэраг асаблівасцей і якасцей, напрыклад здароўе, пладавітасць і г.д. Так, на вяселлі дарылі медныя манеты і прымаўлялі: *"Дарую медзі, каб дзеці былі, як мядведзі".*
- Каб быць з "чыстым" тварам, г. зн. прыгожым, здаровым, на Вялікдзень мыліся "праз срэбра", г.зн. у ваду клалі срэбную манету.
- Манеты выкарыстоўвалі падчас Калядных варожбаў: запякалі ў хлебе, клалі ў чыгун з кашай, пад падушку, у крынічную ваду. Ва ўсіх сітуацыях той, хто станавіўся ўладальнікам гэтай незвычайнай манеты, лічыўся ўдачлівым на працягу года: яго мары абавязкова спраўдзяцца.
- Пры будаўніцтве хаты ў падмурак абавязкова "закладвалі" адну-дзве манеты і прымаўлялі: *"Каціся ў кут срэбра, у хату на дабро".*
- Падчас уваходзін ці ўлазін разам з зернем жыта на падлогу кідалі і некалькі манет, пры гэтым гаварылі так: *"Выкупляю хату не жыхарамі, а грашамі".*
- Каб быць з грашамі на працягу года, нашы продкі раілі патрэсці-пазвінець грашыма ў кішэні, калі ўвесну першы раз пачуеце зязюлю.

Цытата

*Добро должно быть с кулаками.*

С. Куняев

Каб дабро з кулакамі было,
І валодала боксам пры гэтым,
То ўсё роўна б не перамагло
Зло, што любіць хадзіць з пісталетам...
Вось каб мела дабро аўтамат,
Тады б шанцаў было ў яго шмат.

***Анатоль Цыркуноў.***



# Акуліна Міхайлаўна СТАРЧАНКОВА (1916-2009)

**2 сакавіка 2009 года на 93-м годзе жыцця памерла Акуліна Міхайлаўна Старчанкова.**

**Яна нарадзілася ў Брылях 24 чэрвеня 1916 года у сям'і Міхаіла і Варвары Парфененка, і на ўсё жыццё засталася вернай сваім родным мясцінам. З маленства добра зведала, што такое цяжкая сялянская праца. Была сведкам тых вялікіх зрухаў, што адбываліся ў краіне Саветаў, і бачыла самы пачатак калгаснага будаўніцтва. І пасля ўстанаўлення новага ладу ўсё сваё свядомае жыццё прысвяціла самаадданай і карпатлівай працы ў калгасе імя Ільіча.**

**Яшчэ даваеннай парой лёс звёў Акуліну Міхайлаўну з Васілём Старчанковым -- і над брылеўскім небам раскрылася прыгожае суквецце новай маладой сям'і, адкуль пайшлі ў жыццё чацвёра дзяцей. А потым была вайна, і Васіль пайшоў на фронт, дзе і паклаў сваё жыццё на алтар агульнай Перамогі. А Акуліна Міхайлаўна ўжо больш нікому не аддала сваё сэрца, моўчкі узняўшы на плечы нялёгкія сямейныя турботы.**

**І было жыццё -- з смуткамі і радасцямі, і была праца -- пасялянскі няпростая. А вакол былі людзі, большасць з якіх былі чулымі і добразычлівымі. І ў якіх засталася памяць пра светлага чалавека...**

**Бывайце, Акуліна Міхайлаўна!..**

*АДНАВЯСКОЎЦЫ.*

## Сяброўкі

Калі глядзіш на вось гэты пажоўклы фотаздымак, то адразу адчуваешь подых часу. І бачыш тое незваротнае, што было калісьці наяве, -- як брылеўскія дзяўчаты збіраліся ў магілёўскае фотаатэлье і як іх рассаджваў стары яўрэй - фатограф перад вялікім драўляным фотаапаратам: злева насадзіў Матруну Міхайлаўну Кірэеву, справа -- Ганну Іванаўну Манкевіч, ззаду па цэнтру гэткай прыгожай дамінантай паставіў Ганну Васільеўну Афітаву, справа ад яе (злева ад нас) размясціў Хадору Сцяпанаўну Манкевіч, а з другога боку Акуліну Міхайлаўну Парфененка, якая праз каторы час пойдзе замуж за Васіля Старчанкова... По камандзе фатографа ўсе замерлі, аб'ектыў выблісnуў сваім шкляным вокам -- і імгненне спынілся назаўсёды, даючы нам магчымасць зазірнуць у той дзень пачатку 30-х, калі брылеўскія дзяўчаты надумалі сфатаграфавацца на памяць...

Фота з архіва Наўзеі Дзмітрыеўны і Уладзіміра Пракопавіча Арцюшэнка.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© "Брылеўскі летапіс", 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ